УДК 94 (476) “1920”

# БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ ГРУПЫ БУЛАК–БАЛАХОВІЧА Ў ЖНІЎНІ–ВЕРАСНІ 1920 Г

***Сяргей Ісакаў***
*Пінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаецца баявая дзейнасць групы генерала Булак–Балаховіча. Аўтар апісвае падзеі жніўня–верасня 1920 г. Асаблівая ўвага надаецца аперацыі па захопу групай Булак–Балаховіча горада Пінска. Артыкул арыентаваны ў першую чаргу для спецыялістаў – даследчыкаў гісторыі польска–савецкай вайны, гісторыкаў, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца ваеннай гісторыяй Беларусі.

***Ключавыя словы: пяхота, артылерыя, бронецягнік, кавалерыя***

У беларускай гісторыі постаць С.Н. Булак–Балаховіча застаецца спрэчнай. Чалавек, які паспеў павараваць амаль за ўсіх: за царскую Расію, за савецкую Расію, за белую Расію, за незалежнасць Польшчы, зрабіць паход на Палессе – каб стварыць сваю дзяржаву. За гэтыя ўчынкі генерала называюць авантурыстам, многія не могуць дараваць яму габрэйскіх пагромаў. Аднак, факт застаецца фактам, Булак–Балаховіч з’яўляўся таленавітым стратэгам. За 1920 г. атрад Булак–Булаховіча паспеў пабываць у складзе 3-й і 4-й армій Польшчы [3, арк. 7].

З 17 жніўня група знаходзілася на пастоі ў ваколіцах Уладавы, якая адначасова з’яўлялася базай групы [3, арк. 34]. Групе было загадана правесці дыверсійны рэйд па тылам Чырвонай Арміі. 23 жніўня была захоплена в. Пішча. 27 жніўня былі захоплены в. Персеры і Хрыпска Воля. 10 верасня была ўзята вёска Смаляры, дзе ў палон здалося каля 300 чырвонаармейцаў. У верасні быў захоплены Камень–Кашырскі, дзе у палон здалося да 1000 чырвонаармейцаў і каля 500 абозных калёс. 21–22 верасня быў захоплены Любешоў, каля якога быў разбіты 88 пяхотны полк [1, с. 408]. Група Булак–Балаховіча ўвайшла на тэрыторыю гістарычнай Піншчыны.

Генеральны штаб Польшчы адводзіў асаблівую ролю групе Булак–Балаховіча. На тэрыторыі Палесся было цяжка весці баявыя дзеянні з-за вялікіх абшараў балот, лясоў і рэк, і тады было вырашана выкарыстаць асабістыя якасці генерала–партызана Булак–Балаховіча. Перад групай была пастаўлена галоўная задача, якая заключалася ў правядзенні дыверсій у тыле ворага [4, арк. 33], дзе патрэбна было знішчаць камунікацыі і невялікія аддзелы ворага. Для правядзення такіх аперацый, патрэбна была і адпаведнае войска. Войска Булак–Балаховіча складалася з трох родаў войск: пяхоты, кавалерыі і артылерыі. У шэрагі групы ўваходзілі дасведчаныя салдаты і афіцэры. Амаль кожны чацвёрты жаўнер войска Булак–Балаховіча быў афіцэрам. Адрозненне групы ад польскіх і савецкіх часцей была ў тым, што яна хутка аднаўлялася за кошт палонных чырвонаармейцаў. Для прыкладу можна прывесці дадзеныя:

*Табліца №1 Колькасць атрада С.Н. Булак–Балаховіча з жніўня па верасень 1920 г. [5, с. 486, табліца складзена аўтарам ]*

| Дата | Колькасць штыкоў | Колькасць кавалерыі | Колькасць гармат | Колькасць кулямётаў |
|---|---|---|---|---|
| 01.08. 1920 г. | 1000 | – | – | – |
| 25.08. 1920 г. | 4 палкі – 1600 | 3 эскадроны – 400 | – | 16 |

ПолесГУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 23.09.1920 г. | 1800 | 800 | 1 батарэя – 3 трохдзюймовыя гарматы. | 24 |

Камандуючы 4-й арміяй генерал Сікорскі, якому на той момант падпарадкоўваўся генерал Булак–Балаховіч, даручыў яму прарвацца цераз фронт і авалодаць важнейшым апорным пунктам г. Пінскам [2, с. 423]. 25 верасня група Булак–Балаховіча спынілася на пастой у мясцовасці Войнаўка–Судча [6, с. 267], дзе на нарадзе было вырашана нанесці ўдар па г. Пінску з двух бакоў: палкоўнік Паўлоўскі, камандзір Смаленскага палка павінен быў скрытна рухацца на першым этапе ў напрамку в. Кухча–Локня–Марочна–Парэ [6, с. 267], а на другім этапе павярнуць на поўнач в. Вялікія Дворцы–Веляцічы–Горнава–р. Струмень [5, с. 441]. Пасля пераправы праз р. Струмень узарваць чыгунку на ўсход ад Пінску, каб не падаспела дапамога гарнізону Пінска з боку Лунінца, і потым на завяршальным этапе атакаваць чыгуначны вакзал горада. Асноўныя сілы на чале з генералам Булаховічам, павінны былі прайсці на першым этапе наступлення маршам в. Войнаўка–Судча–Спікатымша–Кутынь–воз. Нобель–Невель, на другім этапе маршу прайсці праз в. Невель–Жыдча–Малая Вулька–Вялікая Вулька–Савічы (не знойдзена звестак пра вёску, магчыма гэта в. Іванікі)–Жытнавічы–р. Піна–Дамашыцы–г. Пінск [6, с. 268] (Дадатак А). Пераправіўшыся праз раку каля в. Невель, група патрапіла на аддзел пяхоты ворага. Пасля непрацяглага бою, аддзел здаўся ў палон. У раёне в. Савічы (Іванікі) па дадзеных разведкі знаходзіўся загараджальны батальён. Было прынята рашэнне – атакаваць вёску кавалерыяй. Батальён быў заспеты знянацку, і ў полным складзе патрапіў у палон. Пасля заняцця вёскі Дамашыцы, быў узарваны чыгуначны мост, знішчана тэлеграфная лінія [6, с. 269]. Аднак з боку в. Малоткавічы па чыгункі падышло два бронецягнікі Чырвонай Арміі, якія маглі парушыць планы Булак–Балаховіча. Таму было вырашана пакінуць заслон ад бронецягнікоў у складзе Гдоўскага палка, 2-х гармат, каменданцкай роты і 3-х эскадронаў кавалерыі [6, с. 270]. У ходзе бою быў знішчаны 1 бронецягнік. На нарадзе ў вёсцы Дамашыцы, было канчаткова вырашана атакаваць г. Пінск. 11 г. 00 хв. – 15 г. 30 хв. праходзіла скрытнае перамяшчэнне палкоў на свае запланаваныя пазіцыі. Перад штурмам сілы бакоў амаль былі роўныя:

*Табліца №2 Сілы бакоў перад боем за г. Пінск [6, с. 264 ]*

| Агульная колькасць наступаючых сіл Балаховіча на Пінск. | Агульная колькасць гарнізона Пінска. |
|---|---|
| Каля 2600 штыкоў і сабель, некалькі дзесяткаў кулямётаў, 3 гарматы. | Каля 2400 чырвонаармейцаў і камандзіраў, некалькі кулямётаў і гармат. |
| 1. Мінска–Літоўскі (Мінскі) полк – 350 штыкоў. | Запасны полк і тылавыя атрады – 2000 чалавек. |
| 2. Смаленскі полк – 400 штыкоў. | Штаб 4-й савецкай арміі – 400 афіцэраў. Камандуючы 4 арміяй – Шуваеў. |
| 3. Мазырскі полк – 360 штыкоў. | |
| 4. Гдоўскі полк – 300 штыкоў. | |
| 5. 1-я дывізыя кавалерыі – 700 шабель. | |
| 6.Артылерыйская батарэя – 3 гарматы. | |
| 7. Каменданцкая рота – 240 штыкоў. | |
| 8. Асабісты эскадрон Балаховіча – 120 шабляў. | |

У 15 гадзін 30 хвілін з стрэлаў кулямёта і стрэлу з гарматы пачаўся штурм горада Пінска, які быў атакаваны з 3 бакоў. 2 палкі атакавалі горад з поўначы і захаду, галоўная іх задача была ў захопе чыгуначнага вакзала і штабу 4-й арміі. З поўдня горад атакаваў Булак–Булаховіч на чале 4 эскадронаў кавалерыі (Дадатак Б). Адзіны, хто не змог выканаць

пастаўленыя задачы і падтрымаць наступленне, быў Смаленскі полк на чале з палкоўнікам Паўлоўскім. Бой працягваўся каля 30 хвілін, і скончыўся ў 16 гадзін. Гарнізон горада ў складзе запаснога палка і тылавых часцей 4-й арміі не змог аказаць супраціўлення [1, с. 409]. У палон патрапіў штаб 4-й арміі, каля 2000 чырвонаармейцаў і 400 афіцэраў [2, с. 423]. Палонных камісараў, якія засядалі ў савецкіх установа адразу расстралялі [2, с. 424]. Збегчы ўдалося толькі камандуючаму 4-й арміі Шуваеву, начальніку штаба і частцы каманднага складу арміі ў г. Лунінец. Захоп групай Булак–Балаховіча г. Пінска разрэзаў 4-й армію на дзве часткі. У горадзе захоўваўся рыштунак усёй арміі, было захоплена 30 000 пар ботаў, некалькі тысяч кажухоў, склады з харчам, 3 лакаматывы. Аднак, сітуацыя для групы Булак–Балаховіча заставалася небяспечнай. Непадалёку ад г. Пінска яшчэ заставаліся баяздольныя часці Чырвонай Арміі, якія маглі контратакаваць. У раёне в. Сошна–Парахонск знаходзілася 11-я дывізія пяхоты, каля в. Ахова – 7-я брыгада каўказкай кавалерыі, аднак загаду на наступленне не было. 18 г. 00 хв. – з боку Лунінца прыбыў бронецягнік, які пачаў абстрэл гораду з кулямётаў і гармат [6, с. 272]. Сітуацыя для групы Балаховіча палепшылася толькі тады, калі ў г. Пінск усё ж такі дайшоў Смаленскі полк, які з–за частых сутычак з аддзеламі ворага спазніўся на генеральнае наступленне. 27 – 29 верасня 1920 г. адбываліся лакальныя баі часцей 18 дывізіі і групы Булак–Балаховіча, з адступаючымі з раёна Драгічын – Янава савецкімі часцямі, якія не ведалі, што г. Пінск заняты польскімі войскамі.

Падраздзяленні аператыўнай групы Булак–Балаховіча выконвалі з 26 верасня – 2 лістапада 1920 г. паліцэйскія функцыі ў горадзе. Аднак, не абышлося без здарэнняў. На імя міністра вайсковых спраў Польшчы дайшоў ліст ад Хіршхорна Халперна, дзе ішла гаворка пра габрэйскі пагром 26 верасня 1920 г. у ходзе якога “балахоўцы” рабавалі маёмасць, згвалцілі 60 жанчын і забілі некалькі чалавек. Аднак, амаль ніякіх санкцый да групы Булак–Балаховіча не было прынята, акарамя выводу яго войска з г. Пінска.



*Малюнак 1. Схема штурму г. Пінска войскамі Балаховіча*

Баявыя дзеянні ў жніўні–верасні 1920 г. паказалі паспяховасць тактыкі дыверсій у тыле ворага. Бывала, што перабой у харчах і боепрыпасах, сувязі аказваў большы маральны ціск, чым паражэнне ў бітве. Таму штаб 4-й польскай арміі загадаў генералу Булак–Балаховічу захапіць г. Пінск, дзе размяшчалі склады з рыштункам усёй 4-й савецкай арміі. Яшчэ адной акалічнасцю з’яўлялася тое, што ў горадзе размяшчаўся штаб арміі, захоп якога дазволіў б паралізаваць усе войскі Чырвонай Арміі на тэрыторыі Палесся, і паспешыць іх адступленне. З пункту гледжання стратэгіі Балаховіч правёў бліскучаю аперацыю па захопе горада. Сілы аператыўнай групы, былі амаль роўныя сілам абаронцаў.

У складзе  аператыўнай групы былі дасведчаныя жаўнеры, а гарнізон г. Пінска складаўся з запаснога палка, які амаль не ўдзельнічаў у баявых дзеяннях.

1. Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А. М. Літвін [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2012. – 711 с.
2. Грыцкевіч, А. Выбранае / Анатоль Грыцкевіч; уклад. і камент. аўтара, прадм. А. Мальдзіса. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 608 с.
3. 3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд  2301. – Воп. 1. – Спр. 14. Аналитические сводки 3 А.
4. ДАБВ. – Фонд  2301. – Воп. 1. – Спр. 37. 84 пехотный полк.
5. Какурин, Н.Е. Война с белополяками 1920 г. / Н.Е. Какурин, В.А. Меликов. – Москва: Государственное военное издательство, 1925. – 545 с.
6. Ліс–Блонскі, С. Балахоўцы: Сведчанні, дакументы, даследаванні / С. Ліс-Блонскі; – 2-е выд., дапоўненае і перапрацаванае – Смаленск : Інбелкульт, 2014. – 470 с.

Полесгу